Catholic.by

26.09.2018

# Лічба дня – 123. Столькі арганаў знойдзена і апісана ў Беларусі




**У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі 25 верасня прэзентавалі кнігу «Арганы Беларусі», якая выйшла ў выдавецтве «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі».**

Матэматык, арганіст і складальнік кнігі Аляксандр Бурдзялёў сумесна з фатографам Анатолем Дрыбасам праехалі 13 тысяч кіламетраў у пошуках ацалелых экземпляраў «караля музычных інструментаў».

У выніку было выяўлена і апісана 123 арганы, большасць з якіх у Заходняй Беларусі.

Цяпер у планах складальнікаў размясціць інфармацыю ў інтэрнэце, каб факты можна было дадаваць і абнаўляць.

Паводле слоў дырэктара выдавецтва Уладзіміра Андрыевіча, гэтая кніга — першы падрабязны каталог арганаў у Беларусі. У новай энцыклапедыі можна знайсці навуковыя даследаванні, імёны знакамітых музыкантаў і кампазітараў, арганных майстроў, а таксама тэхнічныя характарыстыкі кожнага з апісаных інструментаў.




Выданне «Арганы Беларусі» — частка серыі «Энцыклапедыя рарытэтаў». Даследаванне заняло амаль год, а сама экспедыцыя працягвалася 39 дзён. Кніга выйшла пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

У Польшчы, Літве і Расіі ўжо былі праведзены падобныя даследаванні і выдадзены аналагічныя кнігі. Беларуская частка арганнай гісторыі заставалася найменш вывучанай, бо да гэтага даследавання на гэтую тэму выдавалася толькі праца маэстра Уладзіміра Неўдаха *Cantantibus organis*, якая ўбачыла свет у выдавецтве «Тэхналогія» амаль 20 гадоў таму.